XXIX нядзеля звычайная

Аўтар: Рэдакцыя
13.10.2011 01:00



З Евангелля св. Мацвея

Фарысеі пайшлі і раіліся, як бы падлавіць Езуса на словах.

І пасылаюць да Яго вучняў сваіх разам з прыхільнікамі Ірада, каб сказалі: «Настаўнік, мы ведаем, што Ты праўдзівы і Божаму шляху праўдзіва навучаеш, і не зважаеш ні на каго, бо не глядзіш на асобу чалавека. Таму скажы нам: як Табе здаецца, ці належыць даваць падатак цэзару, ці не?»

Але Езус, ведаючы іх злаславасць, сказаў: «Чаму выпрабоўваеце Мяне, крывадушныя? Пакажыце Мне падатковую манету». Яны прынеслі Яму дынар. І кажа ім: «Чыя гэта выява і надпіс?» Кажуць Яму: «Цэзара». Тады кажа ім: «Дык аддайце цэзарава цэзару, а Божае - Богу». †

Мц 22, 15-21

Не блытаць трона з алтаром

Кароткае выказванне “Аддайце цэзарава цэзару”, якое не патрабуе каментарыя, не пакінула сумненняў адносна сувязі паміж хрысціянінам і зямной уладай. Рымскі пракуратар Понцій Пілат пачуў ад асуджанага на смерць Езуса: “Не меў бы ты ніякай улады нада Мной, калі б табе не было дадзена зверху” (Ян 19, 11). Св. Павел у Лістах заклікае маліцца за правіцеляў, таму што ўлада зыходзіць ад Бога і павінна служыць грамадству. Такім чынам, тленны парадак мае ўласную прастору і кіруецца ўласнымі законамі, у той час як звышнатуральны парадак датычыцца рэчаіснасці, якая выходзіць далёка за рамкі тленнасці. Трон – свецкая ўлада – і алтар, які належыць Богу, павінны паважаць адзін аднаго і берагчы аўтаноміі, якія ім належаць.

З гэтага вельмі зразумелага правіла Езуса хрысціяне выводзяць права на абарону закону Божага, каб свецкія ўлады выпадкова не прысвоілі сабе паўнамоцтваў, якія належаць духоўным уладам, каб выпадкова нейкі тленны правіцель не пераблытаў свайго трона з алтаром Бога. Касцёл для абароны сваіх праў карыстаецца Божым словам і абяцаннем Хрыста, які сцвярджаў, што “Брамы пекла яго не перамогуць”. Гісторыя ведае прыклады паспяховай барацьбы за годнасць Божых алтароў і вольнасць Касцёла. Часта гэтая абарона мела цану пакутніцкай крыві.

Кс. Яраслаў Грынашкевіч